Источник: "Беларусь" - №4, 2019-03-26



# ГЕНЫ СКАЖУЦЬ ПРАЎДУ



ЛЮБОЎ МАЛЫШАВА

**Дыягностыку многіх спадчынных захворванняў цяпер можна правесці загадзя і ацаніць схільнасць да іх. А ў хуткай будучыні навукоўцы змогуць па генах скласці дэталёвы партрэт знешнасці, характару і схільнасцяў чалавека. Колькасць ахвочых зазірнуць унутр сябе расце.**

Загадзя паклапаціцца пра сваё здароўе і пра будучыню народжанага жадаюць і маладыя бацькі: толькі ў Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры «Маці і дзіця» штогод каля 4 тысяч чалавек праходзяць ДНК-дыягностыку. З нядаўніх часоў даследчыкі пайшлі яшчэ далей дзякуючы навукова-тэхнічнай праграме Саюзнай дзяржавы па ДНК-ідэнтыфікацыі. Прычым да новых метадаў звярнуліся не толькі навукоўцы, але і медыкі, крыміналісты.

— Асоба чалавека прыкладна на 75 % вызначаецца яго генамі — знешнасць, характар, здольнасці, здароўе, — распавядае загадчыца лабараторыі генетыкі чалавека Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі Ірма Масэ. — І толькі каля 25 % — гэта ўклад адукацыі, выхавання, ладу жыцця. Таму, ведаючы генатып, можна шмат пра што даведацца.

Па словах намесніка начальніка галоўнага ўпраўлення судова-медыцынскіх экспертыз цэнтральнага апарата Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Сяргея Бароўкі, тэхналогіі праграмы ДНК-ідэнтыфікацыі дапамогуць атрымаць такія дадзеныя аб падазроным, што фактычна можна будзе скласці фотаробат меркаванага злачынца і яго псіхалагічны партрэт, а таксама вызначыць генетычныя адхіленні і схільнасць да хранічных хваробаў. Праграма толькі набірае абароты, наперадзе яшчэ 3 гады напружанай працы.

Вольга **Савіцкая**



Вольга Савіцкая. Гены скажуць праўду